Радыё Свабода

ЛЮДЗІ

Міліцыя толькі з трэцяга разу змагла «правільна» забраць актывіста Васьковіча. Затрыманы да заўтра, вязуць у ізалятар

13 сакавік 2017, 13:34

АБНОЎЛЕНА 13 сакавік 2017, 16:29

ДН

Абноўлена, 16.29: Васьковіча затрымалі да наступнага дня, адабралі тэлефон. Цяпер яго вязуць у ізалятар. Пра гэта ён пасьпеў распавесьці жонцы.

Дадому да былога палітвязьня, актывіста **Яўгена Васьковіча** міліцыя прыходзіла двойчы, і двойчы сыходзіла безь яго: першы раз бяз позвы, другі раз зь няправільнай. Забралі толькі з трэцяга разу.

Першы раз да Васьковічаў пагрукалі ў дзьверы два міліцыянты і запрасілі Яўгена «праехаць зь імі», з усьмешкай дадаўшы: «Нам надакучыла вас чакаць». Яўген адмовіўся, бо няма ніякай афіцыйнай позвы.

«Я іх папярэдзіў адразу, каб ня думалі выбіваць дзьверы ці нешта такое, — распавёў Свабодзе Васьковіч. — Калі ўсё зробяць акуратна, законна, я і сам пайду, я ж не адмаўляюся, што ўдзельнічаў у мітынгу».

Потым прыйшоў міліцыянт, афіцыйна прадставіўся, прынёс позву. Але Яўген угледзеў, што яна складзеная няправільна: напрыклад, не напісаная прычына, зь якой запрашаюць, і зноў адмовіўся ісьці.

У трэці раз са слушна складзенай позвай прыйшоў падпалкоўнік **Сяргей Рудзько**. Васьковіч прыняў позву і пагадзіўся праехаць зь міліцыянтамі.